Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
_______________Ю.П.Бондар
«_____» _____________2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СЦЭНІЧНЫ РУХ

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады*
*(па напрамках)*

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнікі:**

*І. А. Смірнова,* прафесар кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;

*А. В. Шэдава,* дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*Р. І. Баравік,* загадчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;

*Н. А. Карчэўская,* дацэнт кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 13 ад 13.06.2011 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 29.11.2011 г.)

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *І. А. Смірнова*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма «Сцэнічны рух» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады.

«Сцэнічны рух» з'яўляецца адной са спецыяльных дысцыплін для студэнтаў напрамку «спевы», якая спрыяе фарміраванню неабходных кампетэнцый, уменняў і навыкаў, што ў цэлым дазваляе спеваку ажыццяўляць выканальніцкую і педагагічную дзейнасць на высокім прафесійным узроўні.

Дысцыпліна «Сцэнічны рух» цесна ўзаемазвязана з такімі спецыяльнымі дысцыплінамі, як «Вакал», «Пастаноўка голасу», «Вакальны ансамбль», «Майстэрства акцёра», «Сцэнічная мова», «Пастаноўка вакальнага нумара».

Сучасны стан развіцця шоу-бізнесу прадугледжвае дасканалае валоданне складаным комплексам выразных сродкаў, адным з якіх з'яўляецца сцэнічны рух. Менавіта сцэнічны рух дапамагае спеваку ўвасабляць пластычную складаючую музычна-сцэнічнага вобраза. Таму ў падрыхтоўцы эстраднага вакаліста дысцыпліна «Сцэнічны рух» займае значнае месца.

*Галоўная мэта* дысцыпліны – падрыхтоўка кваліфікаваных спецыялістаў да самастойнай прафесійнай дзейнасці ў сферы эстраднага мастацтва і педагогікі, здольных ствараць арыгінальныя музычна-пластычныя нумары.

*Галоўнымі задачамі* дысцыпліны з'яўляюцца:

– выхаванне культуры сцэнічнага руху спевака, развіццё яго творчай індывідуальнасці;

– фарміраванне комплексу тэхнічных і прафесійных навыкаў і ўменняў, якія забяспечваюць дакладнасць і выразнасць сцэнічнага руху выканаўцы-спевака;

– набыццё студэнтамі ўмення самастойна засвойваць вучэбны матэрыял, працаваць з відэаматэрыяламі;

– развіццё навыкаў фарміравання задумы арыгінальнага пластычнага вобраза і яго ўвасаблення.

У выніку вывучэння дысцыпліны «Сцэнічны рух» выпускнік павінен *ведаць:*

– асноўныя прынцыпы ўвасаблення сцэнічнага руху;

– асноўныя элементы сучаснай харэаграфіі;

– выразныя сродкі сцэнруху;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– практыкаванні, накіраваныя на развіццё псіхафізічных якасцей вакаліста.

Выпускнік павінен *умець:*

– увасабляць прынцыпы сцэнічнага руху ў розных умовах сцэнічнай пляцоўкі;

– валодаць на практыцы элементамі сучаснай харэаграфіі;

– выконваць практыкаванні, накіраваныя на развіццё мышцаў цела і пластыкі;

– пластычнымі сродкамі ўвасабляць мастацкі вобраз вакальнага твора;

– выкарыстоўваць выразныя сродкі харэаграфіі для ўвасаблення арыгінальнага сцэнічнага вобраза.

Вучэбная праграма «Сцэнічны рух» прадугледжвае рашэнне складаных прафесійных выканальніцкіх задач з улікам індывідуальных асаблівасцей кожнага студэнта, яго музычна-пластычнай адоранасці, агульнага і музычнага развіцця, кругагляду, спецыяльнай падрыхтоўкі, псіхалагічных асаблівасцей. Для ўдасканалення свайго выканальніцкага майстэрства і пашырэння дыяпазону выразных сродкаў студэнты павінны вывучаць лепшыя музычна-сцэнічныя кампазіцыі вядомых спевакоў, якія працуюць у розных стылявых напрамках акадэмічнай, джазавай, поп- і рок-музыкі. Базай для дасягнення пластычнай выразнасці спевака павінна з'яўляцца сістэма трэнінгавых практыкаванняў, прадугледжаных праграмай.

Аснову выкладання дысцыпліны «Сцэнічны рух» складаюць традыцыйныя (практычныя і індывідуальныя заняткі) і інфармацыйныя тэхналогіі, а таксама агульнадыдактычныя (камунікатыўны, рэпрадуктыўны, праблемны) метады. Асобае значэнне маюць аўтарскія педагагічныя методыкі.

Самастойная работа студэнтаў складаецца з:

– тэарэтычнай падрыхтоўкі да семінараў з выкарыстаннем метадычных і навукова-даследчых матэрыялаў;

– аналізу выканальніцкага майстэрства лепшых майстроў сусветнага і беларускага эстраднага мастацтва.

У адпаведнасці з вучэбным планам вывучэнне дысцыпліны «Сцэнічны рух» разлічана максімальна на 642 гадзіны, з якіх 310 гадзін – аўдыторныя заняткі (2 гадзіны – лекцыі, 308 гадзін – практычныя).

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі |
| Уводзіны | 2 | |
| *Тэма 1*. Падрыхтоўчыя трэнінгавыя практыкаванні як аснова фарміравання сцэнічна-рухальных (пластычных) навыкаў спевака | | 50 |
| *Тэма 2*. Развіваючы трэнінг | | 50 |
| *Тэма 3*. Пластычны трэнінг | | 54 |
| *Тэма 4*. Сцэнічны рух: час, прастора, тэмпарытм | | 17 |
| *Тэма 5*. Сцэнічны рух і музычны рытм | | 17 |
| *Тэма 6*. Сцэнічны рух і музычна-танцавальныя стылі і жанры | | 34 |
| *Тэма 7*. Вакальна-пластычныя эцюды | | 34 |
| *Тэма 8*. Вакальна-пластычнае аднаўленне музычных кампазіцый | | 30 |
| *Тэма 9*. Вакальна-пластычная імправізацыя | | 22 |
| **Усяго …** | **2** | **308** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Месца і роля дысцыпліны «Сцэнічны рух» у падрыхтоўцы эстраднага вакаліста вышэйшай кваліфікацыі. Узаемасувязі дысцыпліны «Сцэнічны рух» са спецыяльнымі і прафілюючымі дысцыплінамі напрамку «спевы»: «Вакал», «Пастаноўка голасу», «Вакальны ансамбль», «Майстэрства акцёра», «Сцэнічная мова», «Пастаноўка вакальнага нумара».

Мэта і задачы курса, праграма курса, залікова-экзаменацыйныя патрабаванні. Формы самастойнай работы студэнтаў.

Рух і дыханне спевака як адзіны фізіялагічны працэс. Сцэнічны рух і вакальная фраза. Сцэнічны рух ва ўзаемасувязі з лексічнымі асаблівасцямі вакальнага твора. Гістарычныя і нацыянальныя асаблівасці лексічнай мовы песні і танца.

Музычны рытм і яго пластычнае ўвасабленне на сцэне. Час, прастора, тэмпарытм, полірытмія.

Сістэма трэнінгавых практыкаванняў у фарміраванні пластычных навыкаў спевака.

Вакальныя жанры і музычныя стылі ў пластычным увасабленні на сцэне. Сцэнічны рух як сродак выразнасці і спосаб увасаблення мастацкага вобраза песні.

### *Тэма 1. Падрыхтоўчыя трэнінгавыя практыкаванні як аснова фарміравання сцэнічна-рухальных (пластычных) навыкаў спевака*

Развіццё і ўмацаванне мышцаў цела.

Практыкаванні ў станка. Правільная пастаноўка корпуса, галавы, рук, ног. Узмацненне рухавасці суставаў і эластычнасці звязак. Развіццё сілы, трываласці, мышачна-рухальнай памяці. Навыкі каардынацыі руху. Навыкі развіцця і канцэнтрацыі ўвагі.

### *Тэма 2. Развіваючы трэнінг*

Развіццё і ўдасканаленне якасцей, якія забяспечваюць гарманічны стан касцёва-мышачнага апарату спевака ва ўзаемасувязі з яго дыханнем.

Практыкаванні на развіццё гнуткасці і расцяжкі. Мышачная памяць. Адчуванне цэнтра цяжару.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 3. Пластычны трэнінг*

Развіццё адчування руху.

Практыкаванні на напружанне і расслабленне. Пластычнасць і выразнасць жэста. Пачуццё бесперапыннага руху. Увасабленне пластыкай цела эмоцый, перададзеных у музыцы. Практыкаванні са сцэнічнымі аксесуарамі. Узаемадзеянне з партнёрамі.

*Тэма 4. Сцэнічны рух: прастора, час, тэмпарытм*

Развіццё навыкаў прасторава-часавага ўспрымання вакальнага твора ў яго пластычным увасабленні.

Засваенне аб'ёму сцэнічнай прасторы.

Сцэнічны рух і яго залежнасць ад тэмпу. Сцэнічны рух у тэмпах presto, allegro, allegretto, moderato, andante, adagio, lento. Увасабленне руху ва ўзаемадзеянні з рознымі тэмпамі. Рухальнае пераключэнне пры рэзкай змене характару твора, яго рытмічных формул і тэмпаў. Сцэнічны рух і рытмічны малюнак вакальнага твора ў прасторава-часавым увасабленні.

Мізансцэнічная распрацоўка прасторы сцэны суадносна з задачамі і мастацкай ідэяй твора.

*Тэма 5. Сцэнічны рух і музычны рытм*

Сувязь пластычных элементаў і рытмікі з характарам музычнага твора. Сцэнічны рух у розных відах музычнага тэмпарытму. Вакальна-пластычнае ўвасабленне розных музычных памераў ($^2/_2$, $^2/_4$, $^3/_4$, $^4/_4$, $^5/_4$, $^6/_8$, $^9/_8$, $^{12}/_8$ і інш.) ва ўзаемадзеянні з дыханнем спевака. Метрычныя акцэнты і сінкопа ў вакальна-пластычным увасабленні. Вакальна-рухальная артыкуляцыя: дуоль, трыёль, квадроль у пластычным і вакальным увасабленні.

*Вакальна-пластычны трэнінг.* Моўна-рухальная і вакальна-рухальная каардынацыя.

Развіццё навыкаў каардынацыі элементаў пластыкі і вакалу, якія выкарыстоўваюцца ў шматлікіх рытмічных формулах розных музычна-стылявых напрамкаў і жанраў: самба, сальса, боса-нова, мамба, румба, блюз, рытм-энд-блюз, рок-н-рол і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 6. Сцэнічны рух і музычна-танцавальныя стылі і жанры*

Адлюстраванне стылявых і жанравых асаблівасцей вакальнага твора ў сцэнічным руху.

Элементы гісторыка-бытавых і народных песень-танцаў. Танцавальныя ўзоры – полька, вальс, марш, танга, самба, румба, сальса, фламенка і інш. Асаблівасці іх вакальна-пластычнага ўвасаблення з улікам нацыянальнай характарнасці. Асноўныя пазіцыі і палажэнні. Асноўныя танцавальныя крокі.

Элементы класічнага танца.

Чачотка (стэп). Асноўныя элементы чачоткі. Палажэнне ног, рук, корпуса. Чачотка пры руху ўперад і назад. Шафл (шаркаючая паходка). Падскок. Дарожка. Дуёль, трыёль, квадроль у стэпе.

Джазавая песня-танец: Boogie-Woogie, Blues, Charlestone, Rock-n-roll, Lindy Hop, Jive, The Big Apple, West Coast Swing, East Coast Swing, Shim Sham і інш. Асаблівасці іх вакальна-пластычнага ўвасаблення з улікам джазавай характарнасці. Засваенне нізкага цэнтра цяжару, прынцыпу ізаляцыі і незалежнасці руху частак цела суадносна з уласным рытмам. Накіраванне рухальнага імпульсу да зямлі. Развіццё пластычнай свабоды вакаліста.

Асноўныя крокі джазавай песні-танца. Асноўныя пазіцыі і палажэнні, хвалепадобныя рухі, перакаты, падзенні, вібрацыя плячыма і ўсім торсам. Пульсацыя торса. Рухі грудной клеткі і бёдраў. Кідкі (kick, flick, flick kick, fan kick, hitch kick, jazz split). Скачкі (barrel jump, hop, stag leap, frog jump). Павароты і вярчэнні (turn, knee turn, pencil turn, spins, turns). Рухі ў камбінаваных спалучэннях.

Hip-hop. Асноўныя пластычныя элементы, палажэнне ног, рук, корпуса. «Кач» цела, скачкі, падзенні, вярчэнні, акрабатычныя рухі. Звязкі рухаў (criss cross, sham rock, back jamp, crab, bounce, monastery, waving, king tut).

*Тэма 7. Вакальна-пластычныя эцюды*

Пластычныя эцюды – сродак фарміравання прафесійных навыкаў спевака і ўвасаблення мастацкага музычнага вобраза. Пластычныя эцюды – стварэнне поліфанічнай выразнасці музычнага твора сродкамі пластыкі і вакалу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё і ўдасканаленне якасцей, якія забяспечваюць сінхранізацыю, асінхранізацыю, полірытмію паміж вакальным і пластычным увасабленнем мастацкага вакальнага вобраза.

Метад сінхранізацыі (сінхронная суадноснасць сцэнічнага руху з музычным рытмам і фразай твора). Вакальна-рухальныя практыкаванні на сінхранізацыю пластыкі і вакалу.

Метад асінхранізацыі (асінхронная суадноснасць сцэнічнага руху з музычным рытмам і фразай твора).

Метад полірытміі (аўтаномнае ўвасабленне рытмаформул музычнага твора голасам і жэстам).

Вакальна-пластычны кантрапункт і полірытмія.

### *Тэма 8. Вакальна-пластычнае аднаўленне музычных кампазіцый*

Вакальна-пластычнае аднаўленне музычных кампазіцый як сродак фарміравання прафесійных навыкаў спевака на аснове вывучэння творчасці выдатных выканаўцаў поп-, рок- і джазавай музыкі.

Вывучэнне прыёмаў выканальніцкай выразнасці лепшых прадстаўнікоў айчыннай і замежнай эстрады.

Метад капіравання (імітацыя прыёмаў выканальніцкай выразнасці лепшых прадстаўнікоў айчыннай і замежнай эстрады). Аднаўленне на практыцы лепшых вакальна-пластычных кампазіцый.

Метад пераймання (імітацыя прыёмаў выканальніцкай выразнасці лепшых прадстаўнікоў айчыннай і замежнай эстрады з абавязковым праяўленнем уласнай творчай індывідуальнасці).

### *Тэма 9. Вакальна-пластычная імправізацыя*

Вакальна-пластычная імправізацыя як сродак фарміравання індывідуальнага творчага падыходу студэнта да стварэння і сцэнічнага ўвасаблення ўласнай вакальна-пластычнай кампазіцыі ў творах поп-, рок- і джазавай музыкі.

Фарміраванне навыкаў самастойнага творчага пошуку індывідуальна-выканальніцкіх сродкаў выразнасці з мэтай увасаблення мастацкай ідэі твора.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самастойнае ўвасабленне кампазіцыйных прынцыпаў пабудовы прасторава-часавага ўвасаблення музычнага твора сродкамі вакальнай і пластычнай выразнасці. Асноўныя кампазіцыйныя формы прасторава-часавага ўвасаблення музычнага твора на сцэне: двухчасткавая (А-В), трохчасткавая (А-В-А/А-В-С), куплетная, блюзавая і іншыя формы.

Індывідуальна-выканальніцкі стыль як праяўленне самастойнага мастацкага мыслення і мастацкага густу. Стварэнне пластычнага іміджу выканаўцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# НФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Ваганова, А. Я.* Основы классического танца : учебник для высш. и сред. учеб. заведений искусства и культуры / А. Я. Ваганова. – 6-е изд. – СПб. : Лань, 2000. – 191 с.
2. *Васильева-Рождественская, М.* Историко-бытовой танец : учеб. пособие для высш. театр. учеб. заведений и хореогр. училищ / М. Васильева-Рождественская. – М. : Искусство, 1963. – 390 с. : ил., нот.
3. *Захаров, Р.* Сочинение танца : Страницы педагогического опыта / Р. Захаров. – М. : Искусство, 1983. – 224 с. : ил., нот.
4. *Никитин, В. Ю.* Модерн-джаз-танец : История. Методика. Практика / В. Ю. Никитин. – М. : ГИТИС, 2000. – 440 с. : ил.
5. *Основы* сценического движения : пособие для культ.-просвет. и театр. училищ / Э. И. Кох [и др.] ; под ред. И. Э. Коха. – М. : Просвещение, 1976. – 222 с. : ил.
6. *Шереметьевская, Н. Е.* Танец на эстраде / Н. Е. Шереметьевская. – М. : Искусство, 1985. – 412 с.
7. *Ястребов, Ю.* Балетмейстер в театре оперетты : метод. пособие / Ю. Ястребов. – М. : Искусство, 1981. – 103 с.


*Дадатковая*


1. *Александрова, Н. А.* Танец модерн : пособие для начинающих / Н.А. Александрова, В.А. Голубева. – СПб. ; М. ; Краснодар : Лань : Планета музыки, 2007. – 126 с. : ил.
2. *Гуткоўская, С.* Стварэнне сцэнічнай кампазіцыі на аснове харэаграфічнага і музычнага фальклору : вучэб. дапам. / С. Гуткоўская, Н. Хадзінская. – Мінск : Беларус. ін-т культуры, – 2000. – 100 с.
3. *Гуткоўская, С. В.* Гарадскія бытавыя танцы : вучэб.-метад. дапам. / С. В. Гуткоўская. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2008. – 140 с. : іл.
4. *Лопухов, А. В.* Основы характерного танца / А.В. Лопухов, А. В. Ширяев, А. И. Бочаров. – Изд. 3-е. – СПб. : Лань, 2007. – 344 с.
5. *Мочалов, Ю. А.* Композиция сценического пространства : Поэтика мизансцены / Ю. А. Мочалов. – М. : Просвещение, 1981. – 240 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Немеровский, А.* Пластическая выразительность актера : учеб. пособие для театр. вузов / А. Немеровский. – М. : Искусство, 1989. – 127 с. : ил.

7. *Секрет* танца / сост. Т.К. Васильева. – СПб. : Диамант : Золотой век, 1997. – 478 с. : ил.

8. *Смирнов, И.В.* Искусство балетмейстера : учеб. пособие для студентов культ.-просвет. факультетов вузов культуры и искусства / И. В. Смирнов. – М. : Просвещение, 1986. – 190 с. : ил.

9. *Шереметьевская, Н. Е.* Прогулки в ритме стэпа / Н. Е. Шереметьевская. – М. : Печатное дело, 1996. – 240 с.

10. *Шкурко, Т. А.* Танцевально-экспрессивный тренинг / Т. А. Шкурко. – СПб. : Речь, 2003. – 192 с. : ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і ўжываецца комплексна:

1) аналіз пластычнай выразнасці спевакоў (вядучых прадстаўнікоў эстраднага мастацтва) падчас выканання музычных твораў;

2) творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць студэнтаў.

*Вучэбнае выданне*

**СЦЭНІЧНЫ РУХ**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады*
*(па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 01.2013. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,77. Ул.-выд. арк. 0,41. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ